**В. Паборцава**

## ПЫТАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МОВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ ФРАНЦІШКА БАГУШЭВІЧА

У першай палове XIX ст. працэс фарміравання новай беларускай літаратуры, які пачаўся ў XVIII ст., адбываўся ў складанай гістарычнай, культурна-палітычнай сітуацыі, што абумовіла забарону выдання кніг на беларускай мове.

Менавіта творчасць Ф. Багушэвіча абудзіла ў беларусаў пачуццё самаўсведамлення і годнасці. Безумоўна, згодна з культурна-палітычнай сітуацыяй пытанне мовы паўстае вельмі востра. Ідэі Ф. Багушэвіча сталі фундаментам ідэалогіі беларускага нацыянальна-вызваленчага і адраджэнскага руху пачатку XX стагоддзя.

У прадмове да «Дудкі беларускай» аўтар зазначае, што «яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але наперш трэба знаць сваю». На працягу XIX стагоддзя ў невыносных умовах існавання афіцыйнай забароны развівалася размоўная мова, але літаратурная і пісьмовая формы былі ў заняпадзе.

Багушэвіч хацеў зрабіць беларускую мову, культуру і літаратуру запатрабаванымі, спрабаваў стварыць ілюзію вялікай колькасці аўтараў, якія пішуць на беларускай мове, таму ўзяў сабе некалькі псеўданімаў: Мацей Бурачок, Сымон Рэўка з-пад Барысава і сваё сапраўднае імя – Францішак Багушэвіч. Пісьменнік працаваў на адраджэнскую ідэю мовы і культуры ўсімі магчымімі спосабамі, быў адным са стваральнікаў новай беларускай літаратуры.

У грамадстве, якое было арыентавана на польскую і рускую культуру, беларускую мову называлі “мужыцкай”. Ф. Багушэвіч асвятляе гэтую праблему ў прадмове да «Дудкі беларускай»: “Вам афяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, да і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя «мужыцкай» завуць, а завецца яна «беларускай»”. Дзякуючы Ф. Багушэвічу ў літаратуры з’яўляецца вобраз мужыка, селяніна, які, як і ўсе людзі, мае права на тое, каб гаварыць на сваёй роднай мове. У беларускай літаратуры адбыўся пераход ад рамантызму да рэалізму, і ўзнік новы літаратурны герой.

Францішак Багушэвіч прымаў актыўны ўдзел у стварэнні новай беларускай літаратуры і мовы, і крэдам яго жыцця былі наступныя радкі:

«Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмерлі...».